ўдзельнікамі дзеяння і захапленні гульнёй, арганічна зліліся з карнавалам. Кульмінацыйным эпізодам трагічнага гратэску "Балаганчык" з'явілася сцэна агульных смутку і надзеі. Гэта было распрацавана вельмі нечакана — лірычны, тонкі, трагічны момант яднання ў агульнай журбе. Пасля эпізоду "Смерць Арлекіна" П'еро і Паяц выйшлі да людзей і, шукаючы абароны ад місцікаў, абдорвалі ўсіх маленькімі званамі і свечкамі. І вось фінал — мноства запаленых свечак і ціхі перазвон званоў, як глыбокі, што зыходзіць з душы, голас Бога.

У гэтым свяце праявіліся сутнасць быцця, часу, прасторы і калектыўнасці. Разуменне таямніцы чалавечага існавання і таямніц быцця наогул робіцца ў прадстаўленні, у карнавале на ўзроўні жывога, непасрэднага кантакту, ва ўзаемадзеянні паміж людзьмі. Узаемасувязь зносін існуе ў саміх паводзінах людзей на карнавале і мае эмацыянальны, пачуццёвы характар. У гэтым перавага свят над іншымі формамі культуры.

Карнавал — гэта радасць жыцця, свята. Ён не сее зерня зла, бо ён само жыццё. Гратэск у карнавале нараджае, пашырае, рассоўвае навакольны сусвет. Ён заклікае да сумеснай творчасці, садзейнічання, саўдзелу. Гратэскавы ланцуг карнавалу: вострасюжэтныя сітуацыі, маскі-вобразы, асаблівыя прыёмы акцёрскай гульні, усё гэта стварае аб'ектыўныя ўмовы для чалавечага трыумфу, дзе ўдзельнікі ў адзіным патоку тэатралізаванага дзеяння рэалізоўваюць калектыўныя светаадчуванне, суперажыванне і сумесна ствараюць "другое жыццё народа".

Н.М.Дзялендзік,
*аспірантка*

## СТАН КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНЫ ПЕРЫЯД

У сучасны момант культура выступае як інфармацыя, увасобленая у практыцы (што адпавядае матэрыяльнай культуры) або ў структурах штодзённай ці спецыялізаванай мовы, навуковых і мастацкіх тэкстах (духоўная культура). Галоўны змест культуры ўяўляе сацыяльная інфармацыя, або асаблівая знакавая сістэма, у якой замацоўваецца сацыяльны вопыт і якая выконвае функцыю сацыялізацыі індывідаў. Культурны працэс успрымаецца як сігнальна-інфармацыйны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вызначальная роля належыць сімвалічнай культуры (маюцца на ўвазе разнастайныя знакавыя сістэмы), культуры, што існуе пераважна ў ідэалізаванай форме або ў выглядзе ідэалаў, з дапамогай якіх рэчаіснасць не толькі адлюстроўваецца, але і перабудоўваецца, развіваецца як творчы працэс. Гэтая культура заснавана на схематызаваных і эталонных спосабах мыслення, успрымання і рэагавання, здабытых і перадаваемых галоўным чынам з дапамогай сімвалаў, якія ўяўляюць характэрныя дасягненні чалавечых груп. Такія сімвалы знаходзяць увасабленне ў матэрыяльных творах, ядро якіх складаюць традыцыйныя ідэі і звязаныя з імі каштоўнасці.

Кожны феномен культуры (філасофскі трактат, літаратурны твор, народнае вераванне) можна аналізаваць перш за ўсё ў сінхранічным вымярэнні ў якасці элемента, рэальныя сэнс і функцыю якога можна зразумець толькі з яго структурнай пазіцыі ў сістэме культуры. Узорнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца працы прадстаўнікоў розных гуманітарных плыняў XX ст. — структуралізму (М.Фуко), культурнай антрапалогіі (Б.Маліноўскі), гістарыяграфіі (Ж. ле Гоф) і інш.

Нацыянальна-культурнае адраджэнне ўсведамляецца як узнаўленне ўсіх культурных набыткаў народа, што існуюць у выглядзе твораў літаратуры, мастацтва, рэлігійных і філасофскіх ідэй, але цяпер па тых ці іншых прычынах не даведзены да свядомасці народа і не сталі яе часткай. Асновай апошняй з'яўляецца гістарычная памяць, без якой асоба не мае сацыяльных каранёў, выступае "манкуртам", адарваным ад грамадскага жыцця.

Згодна з тэорыяй "мазаічнай" культуры французскага сацыёлага Абраама Моля, змест якой адлюстраваны ў яго вядомай працы "Сацыядынаміка культуры", культура — гэта інтэлектуальны аспект штучнага асяроддзя, "экран ведаў", вызначаны выпадкова, статыстычна, які нагадвае валакністае, ці "мазаічнае", стварэнне, складзенае з мноства фрагментаў.

Побач з сімвалічнымі формамі культуры існуюць штодзённыя, якія не з'яўляюцца штучнымі і не накладаюцца на жыццё чалавека штучным шляхам, а быццам вынікаюць з сутнасці яго дзейнасці. Эканамічная, рэгіянальная культура, напрыклад, не зводзіцца толькі да агульнанацыянальных ідэй і каштоўнасцей, мовы і іншых сімвалічных формаў, а адлюстроўвае вопыт жыццядзейнасці этнасаў, тэрытарыяльных абшчын, паселішчаў і інш. Іх патрэбы і інтарэсы звязаны з сутнасцю

чалавека, прыроднымі (кліматычнымі, геаграфічнымі, экалагічнымі) і сацыяльнымі (эканамічнымі, дэмаграфічнымі) умовамі жыцця.

Агульны вопыт спрыяе фарміраванню агульных рыс свядомасці, характару, падсвядомага рэагавання, якія складаюць аснову менталітэту, або глыбінных якасцей чалавека, сацыяльных суполак і абшчын. Менталітэт народа, жыхароў рэгіёнаў і паселішчаў адлюстроўвае як сімвалічную культуру (рэлігію, філасофію, навуку, мастацтва, мараль), так і пачуцці, уяўленні, рытуалы, звычаі, стэрэатыпы мыслення, у якіх сканцэнтраваны істотныя моманты жыцця людзей, замацаваны яго вопыт.

Такім чынам, сутнасць культуры заключаецца ў далучэнні асобы да сацыяльных нормаў і ідэй мадэрнізму і постмадэрнізму, да новых інфармацыйных тэхналогій, культурных узораў, праектаў і схем сацыяльна-культурнага развіцця, заснаваных на навуковых прагнозах і ўсведамленні каштоўнасці асобы, яе інтарэсаў і інтарэсаў іншых. А гэта мае на ўвазе наступнае:

— культурна-асветніцкую дзейнасць па задавальненні культурных патрэбнасцей асобы;

— сацыялізацыю асобы;

— яе індывідуалізацыю;

— нацыянальна-культурнае адраджэнне;

— фарміраванне ідэалогіі мадэрнізму, скіраванай на пераход ад сацыяльных каштоўнасцей індустрыяльнага грамадства (і заснаваных на іх тэхналогій) да каштоўнасцей постіндустрыяльнага грамадства.

Актуальнасць кожнага з гэтых азначэнняў вызначаецца ўзроўнем развіцця грамадства, яго прасторава-часавымі характарыстыкамі, менталітэтам, экалогіяй, ідэалогіяй і інш. Так, апора на існуючыя прыродныя фактары жыццядзейнасці грамадства садзейнічае развіццю народнай культуры, якая ўяўляе асэнсаванне вопыту народа (этнасу) у міфалагічнай, рэлігійнай, філасофскай і навуковай формах, замацаваных у звычаях, традыцыях, рытуалах, ладзе жыцця. Развіццё гэтай культуры адбываецца ў адпаведнасці з прынцыпамі самаразвіцця. Яна ўяўляе вынік сацыягенезу, эвалюцыі адпаведнага этнасу, адпаведнага народа і мае непаўторныя асаблівасці, звязаныя з асаблівасцямі ўмоў жыцця.

Жаданне падпарадкаваць знешнія ўмовы жыцця працэсу задавальнення патрэбнасцей выклікае развіццё рацыянальнай навукова-тэхнічнай культуры, заснаванай на спасціжэнні заканамернасцей развіцця свету, знешніх прычынна-выніковых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сувязей і адносін. Пакарэнне прыроды непарыўна звязана з будаўніцтвам тэхнічных, інфармацыйных і іншых сістэм, абсалютызацыя якіх разбуральна ўздзейнічае на прыроду і чалавека.

Імкненне чалавека валодаць унутраным светам, сабой вядзе да ўзнікнення і развіцця духоўнай культуры (у аснове якой — асэнсаванне каштоўнасцей і сэнсу жыцця), маральнага асваення сацыяльнай рэчаіснасці. Развіццё гэтай культуры заснавана на развіцці індывідуальнасці асобы, яе духоўнасці.

Гармонія ўсіх трох культур стварае ўмовы для гарманічнага развіцця грамадства і асобы.

Ва ўмовах глыбокай трансфармацыі беларускага грамадства і звязанага з ёй змянення акцэнтаў у дынамічнай сістэме каштоўнасцей узнікае шмат праблем, звязаных з сацыялізацыяй асобы. Пад сацыялізацыяй у сучасным сэнсе разумеюць працэс засваення індывідам на працягу жыцця сацыяльных нормаў, ідэалаў і культурных каштоўнасцей грамадства, у якім ён фарміруецца ў дзейнасці і ў сувязі з іншымі людзьмі.

Праз мову, духоўныя каштоўнасці, узоры сімвалічнага ўвасаблення пачуццяў — "экспрэсіўны сімвалізм" — і іншыя формы сістэма культуры карэкціруе і рэгулюе развіццё сацыяльнай сістэмы, сістэмы асобы і нават (праз дзве папярэднія) развіццё чалавечага арганізма. Таму яна адыгрывае вырашальную ролю ў сацыялізацыі асобы, у яе культурным станаўленні і развіцці.

У сістэме асобы існуюць дзве асноўныя асаблівасці: па-першае, сімвалічнасць, г.зн. наяўнасць такіх сацыяльных механізмаў рэгуляцыі паводзін, як мова, культурныя каштоўнасці, рэлігійныя ідэі і іншае, па-другое, нарматыўнасць, або залежнасць індывідуальных дзеянняў асобы ад агульнапрынятых у грамадстве правіл, нормаў, прадпісанняў, якія зноў жа фарміруюцца развіццём культуры. Зыходзячы з гэтага, сацыялізацыю неабходна разумець як працэс "убірання" ў сябе індывідам, г.зн. "інтэрналізацыю" ім, культурных каштоўнасцей ва ўзаемадзеянні са "значнымі іншымі", з прычыны чаго агульназначныя нормы і стандарты культуры становяцца важнай часткай матывацыйнай структуры асобы, рэгулятарам яе дзеянняў.

Культурныя каштоўнасці выступаюць не толькі як узоры пазнання. Яны з'яўляюцца таксама ўзорамі асэнсавання паводзін і свядомасці людзей, арыентацыяй на іх ажыццяўленне. Пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтым каштоўнасцямі культуры лічацца любы пагранічны сэнс учынку, выбару, ацэнкі індывіда або супольнасці, калі гэты сэнс з'яўляецца родавым паняццем у адносінах да такіх пагранічных узораў свядомасці, як прынцып, ідэал, канчатковая мэта, сакральны сімвал і інш. У прасторы культуры сэнсы маюць статус сэнсавых і лагічных сутнасцей.

У грамадскім жыцці вылучаюць каштоўнасці экзістэнцыяльныя (патрэбнасці асобы і яе інтарэсы), рацыянальныя (ідэалы, прынцыпы, мэты), духоўна-маральныя (дабро, свабода і інш.). Згодна з гэтым чалавек стварае духоўны свет, якому шмат у чым адпавядаюць і сацыяльныя лад, змяненні, прагрэс.

Духоўнасць выступае як здольнасць пераводзіць універсум знешняй рэчаіснасці ва ўнутраную прастору асобы, ствараць унутраны свет чалавека, дзякуючы якому рэалізуюцца яго самастойнасць, незалежнасць у зменлівай сітуацыі.

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства для моладзі, якая вучыцца ў школе і ВНУ, рэзка знізілася значнасць духоўна-маральных каштоўнасцей, добрай вучобы, авалодвання высокімі стандартамі культуры (перамясціліся з 2—3-га рангавых месцаў у іерархіі арыентацый на 10—11-е месцы).

І ў такой пераарыентацыі нельга абвінавачваць моладзь, як гэта робяць некаторыя даследчыкі, таму што яна абумоўлена галоўным чынам сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй, у якой апынулася моладзь. Сёння 47,5% юнакоў і дзяўчат Беларусі не маюць магчымасці нармальна існаваць без падтрымкі бацькоў, а кожны пяты (у тым ліку выпускнікі ВНУ) цалкам залежыць ад бацькоў. Амаль палова маладых людзей (45%) выказвае поўнае незадавальненне ступенню сваёй эканамічнай самастойнасці.

Змены, што адбываюцца ў грамадстве, яго эканамічным і палітычным жыцці ў апошнія гады, шмат у чым закранулі ўяўленні аб сутнасці культуры. Калі да нядаўняга часу культура ўяўлялася выключна як ідэалагічная надбудова над эканамічным базісам, то сёння ў большасці выпадкаў эканоміка звязваецца з асаблівасцямі культуры. Таму становіцца відавочным, што адной прапаганды ідэалагічных каштоўнасцей культуры недастаткова. Патрэбны адпаведная сацыялізацыя асобы, уключэнне яе ў сацыяльна-эканамічныя адносіны.

Істотна ўскладняюць сацыялізацыю асобы сацыяльныя працэсы, асабліва ў плане ўздзеяння на яе нацыянальнай культуры. Сацыялізацыя цяпер праходзіць ва ўмовах глыбокага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічнага, палітычнага і сацыякультурнага крызісу, трансфармацыі сучаснага беларускага грамадства. Гэта выклікае сур'ёзныя змены ва ўнутраным свеце чалавека, яго сацыякультурных пазіцыях, перавагах, арыентацыях, вядзе да інверсійных змен у працэсе сацыялізацыі і сацыяльна-культурнай ідэнтыфікацыі асобы. Усё большую ролю пачынаюць адыгрываць два фактары, найбольш устойлівыя да ўплыву знешніх змен, — рэлігія і этнас. Ва ўмовах, калі разбураецца ранейшая парадыгма каштоўнасцей, шмат каштоўнасцей ва ўяўленні людзей змяняецца, этнічная і рэлігійная ідэнтыфікацыя асобы пачынае набываць прыярытэтнае значэнне, істотна пашыраюцца магчымасці ўплыву культуры на сацыялізацыю.

Сацыяльныя стандарты грамадства ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу разбураюцца, "вымываюцца" са свядомасці і паводзін прадстаўнікоў інтэлектуальнай працы з прычыны неспрыяльных жыццёвых умоў, якія вымушаюць апускацца на сацыяльнае "дно".

Ранейшая іерархія сацыякультурных нормаў і каштоўнасцей развальваецца, замяняецца новай, інкарпараванай звонку (беспрынцыповасцю, прыстасавальніцтвам, падменай сумлення прагай нажывы), далёкай ад сацыяльнага статуса інтэлігента. Анемічны інтэлектуал становіцца духоўна стэрыльным, пачынае скептычна ставіцца да каштоўнасцей і пазіцый іншых, якія жывуць імгненнымі ўражаннямі, без сувязі з мінулым і будучыняй. Ён востра адчувае драматызм свайго статуснага відазмянення, яго духоўны свет раз'ядаецца ўзрастаючай інтэлектуальна-маральнай энтрапіяй, а сам ён выходзіць за рамкі сацыялізаванага кола блізкіх яму па духу суб'ектаў, выпадае з уласцівага яму сацыяльнага кантэксту.

Арыентацыя на сацыялізацыю асобы заўсёды з'яўляецца аднабаковай, калі мае на ўвазе выключна існуючыя ў грамадстве нормы і сацыяльныя функцыі, інстытуцыялізаваныя формы паводзін і не ўлічвае развіцця індывідуальнасці асобы як суб'екта культуры.

Сацыяльны парадак не ўяўляе выніку свядомай задумы, а шмат у чым стыхійна ўзнікае з накірунку, вызначанага традыцыйнай (і галоўным чынам рэальнай) практыкай. Людзі, якія арыентуюцца на гэтую практыку, звычайна не ўсведамляюць яе значнасці. Тым не менш менавіта яна вызначае магчымасці розуму, а не наадварот. Выпрацаваныя на працягу гісторыі развіцця этнасу або народа маральныя нормы, эстэтычныя ўяўленні і стыль мастацтва вызначаюць і стыль мыслення.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На адных этапах гістарычнага развіцця грамадства чалавек разглядаецца выключна як састаўная частка прыроды, космасу. На гэтых этапах ён свядома імкнецца вызначыць сваю дэтэрмінаванасць знешнім светам. Прыкладам можа быць старажытная грэчаская цывілізацыя. Для іншых этапаў характэрнае імкненне спасцігнуць свой духоўны свет (сярэднявечча), а яшчэ для некаторых асноўнай мэтай выступае перабудова свету ў адпаведнасці з развіццём асобы не як часткі прыроды, а самастойнага суб'екта навукова-тэхнічнай культуры.

Існуючыя экалагічныя, эканамічныя і іншыя праблемы можна вырашаць на шляху развіцця духоўнай культуры, індывідуальнасці асобы і пазнання сацыяльна-культурнай прыроды кожнага народа, асноўных накірункаў яго сацыягенезу як культуры выжывання. Гармонія прыроднага і духоўнага жыцця магчымая толькі на шляху эвалюцыі народнай культуры, на аснове народнага менталітэту і менталітэту этнасаў, сацыяльных нормаў, якія не з'яўляюцца штучнымі.

Вырашэнне нацыянальных, рэгіянальных, тэрытарыяльных праблем звязана са спасціжэннем прасторава-часавых сацыяльных характарыстык краіны, края, тэрыторыі, паселішча. Нямецкая пунктуальнасць і нашы разважлівасць і схільнасць адкладаць вырашэнне важных спраў на заўтра — гэта не проста рысы нацыянальнага характару. Само паняцце сацыяльнага характару з'яўляецца ключавым для разумення грамадскага працэсу. Характар, як лічыць вядомы амерыканскі даследчык Эрых Фром, — гэта спецыяльная форма чалавечай энергіі, якая ўзнікла ў працэсе дынамічнай адаптацыі чалавечых патрэб да вызначаных узораў жыцця ў грамадстве. Характар — акрэсленыя думкі, пачуцці і дзеянні індывіда.

Становіцца магчымы своеасаблівы светапоглядны пераварот: пераасэнсаванне традыцыйных уяўленняў, згодна з якімі наша мысленне з'яўляецца пераважна інтэлектуальным актам, незалежным ад псіхічнай структуры асобы. Між тым кожныя паняцце, дактрына заключаюць у сабе эмацыянальную аснову, якая вызначаецца складам характару індывіда. Самі ж характар і звязаны з ім тып мыслення развіваюцца з патрэбнасцей авалодання матэрыяльнай сферай, з патрэбнасцей і інтарэсаў сацыяльных груп. Між тым чалавек жыве ілюзорным уяўленнем: быццам бы ён ведае, чаго хоча. На самай справе ён хоча таго, чаго павінен хацець у адпаведнасці з агульнапрынятымі нормамі, правіламі, установкамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У прадстаўнікоў розных культур своеасабліваe выяўленне якасці жыцця, асаблівасцей існуючых у грамадстве формаў сацыялізацыі асобы. У адных грамадствах перайманне існуючых культурных формаў жыццядзейнасці накіравана выключна на старэйшых, на звычай і традыцыю, што замаруджвае рух сацыяльнага часу. Там жа, дзе працэс сацыялізацыі звернуты ў будучыню, звычай знікае і грамадства дынамічна накіроўваецца па шляху змен і росту. Культурнае адлюстраванне часу ажыццяўляецца ў сімвалах, каштоўнасцях, правілах і арыентацыях, якія надаюць грамадству выразнае часавае аблічча.

Матэрыяльныя элементы вытворчых сіл грамадства адыгрываюць вырашальную ролю ў павышэнні эфектыўнасці працы, у сацыяльным прагрэсе і ў фарміраванні новага прадстаўніка. Фарміраванне “чалавечых якасцей” тут ставіцца ў залежнасць ад развіцця тэхнікі, а яно ўяўляецца важнейшай часткай развіцця культуры чалавецтва. Сацыяльна-культурны прагрэс цалкам ставіцца ў залежнасць ад тэхнічнай і прамысловай рэвалюцый, якасных пераўтварэнняў у тэхнічных, энергетычных, арганізацыйных і навуковых асновах працэсу працы. Навука, канструктарскія распрацоўкі, інфармацыя замест энергіі, інтэлектуалізацыя эканомікі — вось асновы мадэрнісцкай культуры, якія сёння ўсё больш выпрабоўваюцца праблемамі матывацыі, індывідуалізацыі і духоўнасці, праблемай творчасці. Ужо ў 60—70-я гады высветлілася, што чалавечыя паводзінскія аспекты арганізацый выяўляюцца ў канкрэтным кадравым складзе, а таксама ў стылі і навыках штодзённай працы. Больш таго, ва ўмовах павышэння патрабаванняў адаптыўнай гнуткасці, зменлівасці гаспадарчай арганізацыі гэтыя характарыстыкі выходзяць на першы план.

У сучасны перыяд неабходна:

1) атрыманне абгрунтаваных ведаў аб месцы і ролі культуры, яе значэнні для фарміравання і змянення сістэмы сацыяльных нормаў і ідэалаў у розныя гістарычныя эпохі, перыяды;

2) вылучэнне разнастайных механізмаў міжнацыянальных, міжрэгіянальных культурных сувязей і абмену, зместу і гістарычнай змены культурных эпох, развіцця і трансфармацыі гаспадарча-культурных рэгіёнаў і цывілізацый;

3) прадметнае знаёмства з гістарычна зменлівымі карцінамі моўных сусветаў, моўнымі формамі паводзін, уласцівымі розным народам свету з іх менталітэтам, нацыянальнымі рысамі характару і інш.;

4) вызначэнне месца і ролі прамежкавай, этнічна і рэгіянальна структураванай культуры Беларусі ў еўрапейскім і сусветным культурна-гістарычным працэсе;

5) усведамленне змястоўнага і структурнага адзінства эканамічнай, палітычнай, прававой, маральнай, рэлігійнай, мастацкай і філасофскай культуры.

**Г.Н.Пілевіч,**
*суіскальніца*

## ПРАГРЭС І ЧАЛАВЕК

XX ст. можна назваць стагоддзем трыумфу навук і адначасова глабальных катастроф: з аднаго боку, адкрыццё ядзернай энергіі, з другога — экалагічныя катастрофы; з аднаго боку, небывалы росквіт інфарматыкі, які дае бязмежныя магчымасці для росту культуры і асветы, з другога — разбуральны рост злачыннасці, наркаманіі, СНіДу, сексуальнай маніі; з аднаго боку, фантастычныя адкрыцці ў навуцы і тэхніцы, якія абвясцілі аб радыкальным перавароце чалавечага быцця, а з другога — страты чалавечых каштоўнасцей, замена якім пакуль не знойдзена. Між тым этнічная і нацыянальная нянавісць, якая ўзрушыла свет, прадаўжае і зараз страшыць людзей.

Стагоддзе небывалага навуковага прагрэсу стала сведкай амаральных крывавых разборак. Індывідуальны геній чалавецтва прыгожы, але прамысловасць псуе планету. І паколькі прамысловасць — тварэнне чалавечых рук, то ў першую чаргу ад чалавека залежыць, наколькі маральнай будзе рэалізацыя геніяльнага патэнцыялу, што супрацьстаіць культуры і духоўнасці, пераход за якія паграджае самазнішчэннем і грамадскай катастрофай.

Адзін з буйнейшых фізікаў XX ст. М.Борн на схіле жыцця прыйшоў да вываду аб тым, што нежыццяздольнасць навукі заключаецца ў служэнні ведам дзеля саміх ведаў. М.Бярдзяеў і іншыя мысліцелі лічылі, што навука "ёсць эканамічнае прыстасаванне да сусветнай данасці", што яна мае "жыццёва-карыслівы характар" і "прагматычную прыроду", якую раскрыў Ф.Бэкан ў XVIII ст. Навука, як яна склалася ў апошнія стагоддзі, стала адгароджвацца не толькі ад маральных і эстэтычных матываў, але і ад самой ісціны, таму што, пачынаючы з часоў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ